УДК 070.23 (1-37)

**І. А. Івашка** (Мінск)

# КАНЦЭПЦЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: РЭАЛІЗАЦЫЯ Ў РАЁННЫМ ДРУКУ

Ва ўмовах глабалізацыі інфармацыйныя тэхналогіі набылі трансгранічны характар і сталі неад'емнай часткай многіх сфер дзейнасці. Сёння забеспячэнне бяспекі інфармацыйнай прасторы займае значнае месца ў рэалізацыі стратэгічных нацыянальных прыярытэтаў любой краіны. Акрамя таго, як справядліва адзначае Т. В. Закупень, «інфармацыйныя ўздзеянні аказваюць вырашальны ўплыў на працэсы адукацыі, фарміравання асобы, яе духоўнага свету і могуць выклікаць неадэкватныя сацыяльныя ці крымінальныя паводзіны груп людзей і пэўных асоб, нанесці фізічны, матэрыяльны і маральны ўрон грамадзянам» [4]. І, паколькі асноўным рэгулятарам у інфармацыйнай прасторы выступае права, актуалізуецца патрэба ў заканадаўчых актах, якія б рэгламентавалі паводзіны краін у інфармацыйным полі (такімі дакументамі з'яўляюцца «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Кыргызскай Рэспублікі», «Дактрына інфармацыйнай бяспекі РФ», «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі рэспублікі Казахстан», «Дактрына інфармацыйнай бяспекі Украіны», «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ» і інш.).

Так, у «Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі рэспублікі Казахстан» інфармацыйная бяспека разглядаецца ў сукупнасці двух узаемазвязаных аспектаў: тэхнічнага і сацыяльна-палітычнага [9]. Першы ўяўляе сабой абарону нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў і сістэм ад неаўтарызаванага доступу, выкарыстання, змянення, прачытання ці знішчэння. Другі аспект заключаецца ў

забеспячэнні бяспекі нацыянальнай інфармацыйнай прасторы ад мэтанакіраванага негатыўнага ўздзеяння, якое можа нанесці ўрон нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Казахстан.

«Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі РБ» (далей – КІБ РБ) разглядае інфармацыйную бяспеку як «стан абароненасці сбалансаваных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы» [6, с. 3]. Аналагічнае вызначэнне прапануе «Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі РБ» [7] і «Канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі Кыргызскай Рэспублікі» [5]. З нашага пункту гледжання, найбольш поўнае азначэнне прапанавана ў «Дактрыне інфармацыйнай бяспекі РФ»: «інфармацыйная бяспека – гэта стан абароненасці асобы, грамадства і дзяржавы ад унутраных і знешніх інфармацыйных пагроз, пры якім забяспечваецца рэалізацыя канстытуцыйных правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, дастойныя якасць і ўзровень жыцця грамадзян, суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць і ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны, абарона і бяспека дзяржавы» [2].

Аднак у рабоце мы прапануем карыстацца больш поўным азначэннем Ю. Лісоўскай, якая, спасылаючыся на работы А. Марушчака, звяртаецца да паняцця *інфармацыйнай бяспекі* ў трох аспектах:

1) як «стану абароненасці жыццёва важных інтарэсаў чалавека, пры якіх прадухіляецца нанясенне ўрону праз непаўнату, несвоечасовасць і недакладнасць інфармацыі, якая выкарыстоўаецца (у п. 34 КІБ РБ пералічаныя аспекты разглядаюцца як пагрозы нацыянальнай бяспекі);

2) як негатыўнага інфармацыйнага ўплыву;

3) як несанкцыянаванага распаўсюджвання, выкарыстання і парушэння цэласнасці, канфедэнцыяльнасці і даступнасці інфармацыі» [8, с. 94].

Вядома, што асноўны нацыянальны інтарэс Беларусі ў інфармацыйнай сферы – рэалізацыя канстытуцыйных правоў грамадзян на атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, праўдзівай і своечасовай інфармацыі [7]. Таму прыярытэтным у інфармацыйнай сферы становіцца «забеспячэнне даступнасці інфармацыі, яе распаўсюджванне і выкарыстанне для <…> развіцця краіны» [6, с. 2]. Невыпадкова ў КІБ РБ адлюстраваны сучасныя выклікі і пагрозы, якія фарміруюцца ў інфармацыйнай сферы і ўяўляюць небяспеку для канстытуцыйных асноў Беларусі: няўстойлівасць інфармацыйнай інфраструктуры, дыскрэдытацыя грамадскіх ідэалаў і каштоўнасцей, кіберпагрозы [11], небяспека для нацыянальнага інфармацыйнага сегменту ў Інтэрнэце [10] і інш.

Глабальнае ўзрастанне ролі інфармацыі ў сістэме грамадскіх адносін, адкрытасць медыяпрасторы і павышэнне ўзроўню інфарматызацыі насельніцтва [6, с. 10] актуалізуюць ключавыя палажэнні 12 главы КІБ РБ («Захаванне традыцыйных асноў і каштоўнасцей»). Гэта абумоўлена тым, што традыцыйныя каштоўнасці – «адзін з галоўных аб’ектаў для абароны ў інфармацыйным полі» [11]. Уяўляецца, што выкананне большасці асноўных палажэнняў дакумента (у прыватнасці, пп. 15, 47, 48, 49, 56 і інш.) магчыма толькі пры ўмове, што нароўні з рэспубліканскімі СМІ, алгарытмы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі будуць пераняты раённымі выданнямі, паколькі мясцовыя газеты маюць найбольшы ўплыў на лакальную аўдыторыю [1, с. 52].

Інфармацыйная палітыка Беларусі накіравана на прасоўванне *гуманізму, міралюбства, дабрасуседства, справядлівасці, узаемадапамогі, моцных сямей-*

*ных адносін, здаровага ладу жыцця, стваральнай працы,* прынятых у беларускім грамадстве *норм маралі і пазітыўнай правасвядомасці* (пункт 47 КІБ РБ). Значнае месца ў рэалізацыі гэтых прынцыпаў адводзіцца раённым газетам.

Так, у «Ляхавіцкім весніку» *тэма стваральнай працы* персаніфікавана – у аснове кожнай публікацыі – аповед пра жыхара раёна[1]. Матэрыялы расказваюць пра кіраўнікоў гаспадарак, настаўнікаў, урачоў, працаўнікоў культуры, аддзяленняў сувязі («Ён [Эдуард Рачкоўскі] хлебароб, араты і бадай увесь светлавы дзень праводзіць … на сельскагаспадарчым палетку» («Не трактар арэ – трактарыст», 17.10.2020 г.); «Пра высокі прафесіяналізм Аляксандра Вітко сведчаць … значныя дасягненні СВК "Ляхавіцкі" – сельскагаспадарчага флагмана раёна…» («Самы аграрны юбіляр», 24.10.2020 г.); «…прафесія, выбраная сэрцам, стала прызваннем. І наша зямлячка [Алена Бяліцкая] ганарыцца тым, што яна адна з … сям'і ляхавіцкіх медыкаў» («Профі вышэйшай катэгорыі», 31.10.2020 г.) і інш.

Падобныя падыходы ў асвятленні пытання выкарыстоўваюць «Лідская газета» («…маладая настаўніца сёлета занесена ў віртуальную Кнігу пашаны маладых спецыялістаў сістэмы адукацыі Гродзеншчыны» («Знайшла сваё прызванне – вучыць дзяцей», 03.10.2020 г.); «Што адрознівае маладое папаўненне? Высокі ўзровень падрыхтоўкі, грунтоўныя веды і… вялікае жаданне набыць працоўны вопыт» («У галіне культуры – новыя таленты», 10.10.2020 г.) і «Добрушскі край» («Раніца рабочых участка па ўтрыманні дваровых тэрыторый "Добрушскага камунальніка" Васіля Ярашэвіча і Алы Дунай … пачынаецца аднолькава: прыбіральшчыкі размятаюць сцежкі і тратуары ад апалага лісця» («Каму "золата, а каму – клопаты"», 07.10.2020 г.); «Кіравацы брыгадай … ён пачаў ва ўзросце ўсяго 25 гадоў. Аляксандр прадоўжыў сямейную традыцыю» («Якасць не залежыць ад узросту», 28.10.2020 г.). У полі зроку журналістаў «Лідскай газеты» – прадстаўнікі камунальных служб, інспектары ДАІ, артысты, пчаляры, маладыя спецыялісты; «Добрушскага краю» – працаўнікі папяровай фабрыкі, народныя майстры, жывёлаводы, механізатары, школьнікі. Асвятленне далучанасці да працы старшакласнікаў – заўважная тэндэнцыя добрушскай раённай газеты.

У суадносінах матэрыялаў пра чалавека да газетнай плошчы «раёнкі» знаходзяцца наперадзе рэспубліканскіх СМІ. У «Ляхавіцкім весніку» сустракаецца ад двух да пяці падобных матэрыялаў за нумар. «Лідская газета» змяшчае ад адной да дзесяці публікацый. Лідарам па публікацыях пра чалавека выступае «Добрушскі край» (ад трох да дзевяці матэрыялаў).

*Пытанні сямейных узаемаадносін* часта ўздымаюць «Ляхавіцкі веснік» і «Лідская газета». Журналісты першага выдання раскрываюць тэму праз аповеды пра маці («Яна [Валянціна Юрлевіч] заўжды старалася быць падобнай на сваю маці, якую лічыць прыкладам мудрасці, веры, жаноцкасці, шчырасці, адданасці сям'і. <…> Сёння яе дачка Алёна Гецман ужо сама мама двух сыночкаў і ва ўсім бярэ прыклад з іх бабулі» («Матуліна шчасце», 14.10.2020 г.). Акрамя таго, на старонках «Ляхавіцкага весніка» змяшчаюцца фотарэпартажы і асобныя фотаздымкі з адлюстраваннем сямейных каштоўнасцей, нярэдка праблематыка разглядаецца ў сінтэзе з іншымі тэмамі.

Журналісты «Лідскай газеты» апелююць да сямейных аповедаў людзей сталага ўзросту («Таму і быў званок … у рэдакцыю «Лідскай газеты»: "У дарагіх

[1] Вывады зроблены на аснове аналіза нумароў «Добрушскага краю», «Лідскай газеты» і «Ляхавіцкага весніка» за кастрычнік 2020 года. Таксама кропкава былі даследаваны выпускі трох газет за чэрвень–верасень 2020 года.

нам людзей залаты юбілей. Пражылі паўвека ў згодзе, чаму і іншым можна павучыцца”» («Каб на дадзены момант давялося жаніцца, дык мы зноў злучаліся б у пару», 03.10.2020 г.); «…в лидском загсе состоялась торжественная регистрация полувекового юбилея. И вновь прозвучал марш Мендельсона, а затем были теплые поздравления, но уже от детей, внуков, правнуков и тот самый вальс» («Бери пример, молодежь», 21.10.2020 г.).

«Добрушскі край» сямейную тэматыку ўзгадвае радзей. Асноўны вектар публікацый – вопыт прыёмных сем’яў («В свои 30 лет Марина и ее муж Дмитрий воспитывают четырех сыновей и двух дочерей. Для большинства своих детей Сайдулины – приемные родители» («Лучики счастья», 31.10.2020 г.). У большасці выпадкаў сямейныя каштоўнасці разглядаюцца журналістамі ў кантэксце матэрыялаў іншай тэматычнай скіраванасці.

*Пазітыўную правасвядомасць* рэдакцыі трох выданняў фарміруюць, звяртаючыся да раскрыцця прававых бакоў праблемы праз выпадак з юрыдычнай практыкі раёна. «Добрушскі край» асвятляе праблемныя сітуацыі *па прынцыпе «праблема – вынік»* («… в первый же месяц учебного года подростки попали в поле зрения правоохранителей более десятка раз. <…> По каждому из вышеуказанных фактов… проводят социальные расследования») («Осенние похождения несовершеннолетних», 03.10.2020 г.); «Добрушские подростки повредили надмогильные сооружения на сельском кладбище. <…> привлечь установленных лиц к ответственности нельзя: не достигли 14-летнего возраста» («Превратности “безобидной” игры», 03.10.2020 г.) і інш.

«Лідская газета» падае матэрыялы *праз канцэпцыю «праблема – алгарытм вырашэння»* («Кто без фликера – тому вопрос. Ответ правильный – значит, без штрафа», 17.10.2020 г.; «Решение им подсказали <…>: вызов геодезистов, суд и мир» («Нарушители границы? Как соседи из деревни Широкое не поделили “пограничный” столб», 21.10.2020 г.).

У прававых матэрыялах «Ляхавіцкага весніка» можна назіраць сінтэз падыходаў: выклад фактаў *па алгарытме «праблема – вынік»* («Домік вокнамі ў бур’ян» (27.05.2020 г.) *і матэрыял-справаздача пасля правядзення сумесных праектаў па інфармаванні з* раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях («“Гардэроб” для пажарных. І не толькі», «На сувязі выратавальнікі»; органамі ЗАГС («Шлюб – падзея не радавая» (27.05.2020 г.), сацыяльнымі службамі («Пенсійныя льготы для ліквідатараў аварыі на ЧАЭС» (25.04.2020 г.).

*Матэрыялы пра здаровы лад жыцця* з’яўляюцца ў трох выданнях як у спецыяльных рубрыках («У аб’ектыве – спорт» і «Журналист изучает ситуацию» (10.10.2020 г.) – «Лідская газета»), тэматычных старонках («Ляхавіцкі раён – 80» у «Ляхавіцкім весніку») і асобных рубрыках («Спортивная орбита» і «Фотофакт» у «Добрушскім краі»). Перыядычнасць выхаду тэкстаў у газетах залежыць ад спартыўных інфармацыйных нагод раёнаў.

Бясспрэчна, беларуская мова нароўні з канстытуцыйна замацаваным у дзяржаве двумоўем садзейнічае павышэнню нацыянальнай самасвядомасці беларускага грамадства і фарміраванню яго духоўнасці. Таму пашырэнне сацыяльных функцый і камунікатыўных магчымасцей беларускай мовы, яе паўнавартаснае і ўсебаковае развіццё разам з іншымі элементамі нацыянальнай культуры выступаюць гарантам гуманітарнай бяспекі дзяржавы (пункт 48 главы 12 КІБ РБ).

Нельга не пагадзіцца з П. Жаўняровічам, які падкрэслівае значную ролю раённых СМІ ў пашырэнні беларускай мовы праз яе выкарыстанне на практыцы [3, с. 163]. «Ляхавіцкі веснік» – цалкам беларускамоўная газета. У «Добрушскім

краі» беларуская мова выступае індыкатарам публікацый, у якіх журналісты прыбягаюць да сінкрэтызму ў падачы матэрыялу. Колькасць тэкстаў на беларускай мове ў добрушскім раённым выданні налічвае ад трох да адзінаццаці публікацый за нумар. Наяўнасць беларускамоўных матэрыялаў у «Лідскай газеце» вар'іруецца ад аднаго да адзінаццаці матэрыялаў. Таксама па-беларуску афармляюцца рубрыкі выдання і асобныя анонсы. Адметна, што нацыянальная мова выкарыстоўваецца журналістамі «Лідскай газеты» для раскрыцця тэм, звязаных з гісторыяй краіны і творчасцю лідчан.

Выкарыстанне ў раённым друку нацыянальнай мовы як асноўнага інструмента ў фарміраванні самасвядомасці грамадства павышае цікавасць да ключавых аспектаў пункта 49 КІБ РБ і спрыяе прасоўванню дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, якая накіравана на замацаванне нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага краіны і беларускай мадэлі памяці ў Беларусі і за яе межамі [6, с. 11].

Супрацоўнікі «Добрушскага краю» асвятляюць *гістарычныя працэсы Беларусі* праз наступныя ракурсы:

- *лёс раёна* (рэпартаж, дасланы чытачом – «За историями – на велосипеде» (03.10.2020 г.);
- *мясцовыя легенды* («Одна из городских легенд гласит: они были построены по кредиту управляющего добрушской писчебумажной фабрикой Антона Стульгинского» («Городские легенды», 07.10.2020 г.);
- *сведчанні дабрушан* (рэпартаж з пошукаў парэшткаў непахаваных салдат ВАВ – «История на дне траншеи» (09.09.2020 г.); «Мой дед Семен Бураков был архитектором. При нем в середине прошлого века Добруш активно обретал тот вид, который мои земляки <…> хранят в своих воспоминанях» – «Добруш в моей судьбе», 10.11.2020 г.) і інш.

Дзевяць кастрычніцкіх нумароў выдання змяшчаюць дзесяць матэрыялаў на гістарычную тэматыку.

«Ляхавіцкі веснік» прытрымліваецца падобнай стратэгіі, што і «Добрушскі край», аднак у большасці выпадкаў рэалізуе яе візуальна – праз фотапраект «Ляхавіцкі раён – 80»: «На спартыўных прасторах» (24.06.2020 г.), «Наша купалаўка запрашае» (15.04.2020 г.), «Культурныя людзі» (19.06.2020 г.), «Настальгія аграрных успамінаў» (26.06.2020 г.) і інш. Гэту адметнасць выдання рэдакцыя называе «Рэтратэкай ЛВ» (фотарэпартажы будуюцца па алгарытме супрацьпастаўлення «сапраўднае-мінулае» і суправаджаюцца тэкстоўкай). Колькасць тэкстаў, прысвечаных гістарычнай тэме за разгледжаны перыяд налічвае адну публікацыю.

Глыбей у тэматычным полі працуе «Лідская газета»: вопыт раёна ці горада, апісаны ў выданні, упісваецца ў глабальны гістарычны кантэкст («Наша бібліятэка <…> паспрабавала адлюстраваць грамадска-палітычнае жыццё горада Ліды ў 50-80-я гг. мінулага стагоддзя» («Імгненні савецкай эпохі ў фоталетапісе Лідчыны», 03.10.2020 г.); «Изображение данскера на стене Лидского замка сохранилось на фотографиях конца XIX века, а также на картине белорусского художника Василия Грязнова…» – у кантэксце публікацыі пра ЖКГ («Обширное хозяйство – для комфорта лидчан», 14.10.2020 г.); «<…> Немецкая авиация совершила налет на ленинградские Бадаевские склады <…>. Чтобы получить заветную краюшечку, маленькая Таня вставала еще затемно: нужно было занять очередь» («Гостеприимен и на свежую выпечку скор лидский "Хлебный двор"», 17.10.2020 г.) – як элемент матэрыяла пра хлеб). На дзевяць нумароў выдання прыходзіцца шэсць публікацый на гістарычную тэму.

Аналіз КІБ РБ і журналісцкіх тэкстаў у газетах «Добрушскі край», «Лідская газета» і «Ляхавіцкі веснік» дазваляе рабіць высновы, што тэмы, якія дапамагаюць рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, раскрываюцца ў раённым друку ў большай ступені. Да іх можна аднесці публікацыі, прысвечаныя працоўнаму чалавеку, аграрнаму сектару, здароваму ладу жыцця, правам і абавязкам грамадзян, а таксама матэрыялы-каментарыі спецыялістаў (псіхолагаў, юрыстаў, прадстаўнікоў МНС, органаў ЗАГС, медыцынскіх работнікаў і інш). Разам з тым, журналісты звяртаюцца да сусветных падзей, сямейных каштоўнасцей, а таксама гістарычнай, сацыяльнай і духоўнай тэматыкі (апошняя прадстаўлена ў двух аспектах – светапоглядным і творчым). Аднак: гэтым пытанням удзелена кропкавая ўвага (сацыяльная праблематыка ў большасці выпадкаў прадстаўлена заметкамі ці справаздачамі з элементамі рэпартажу; аб'ём публікацый на духоўную тэматыку ў выданнях складае ад 1/5 ці 1/4 плошчы паласы за два-тры нумары; пытанні гісторыка-культурнай спадчыны ўздымаюцца неперыядычна). Лічым, што мэтазгодным стане павышэнне колькасці публікацый падобнай скіраванасці за кошт скарачэння аб'ёму крымінальнай хронікі і публікацый пра надзвычайныя сітуацыі («Лідская газета», «Добрушскі край»), справаздач і матэрыялаў, якія не маюць прамога дачынення да жыцця раёна («Ляхавіцкі веснік»). Патэнцыял праананалізаваных раённых выданняў дае падставы сцвярджаць, што асвятленне акрэсленых аспектаў можа ўнесці ў газетныя тэксты больш разгорнуты тэматычна-жанравы складнік і павысіць узровень інтарэсу да матэрыялаў у чытацкай аўдыторыі.

Лагічным бачыцца вывучэнне рэалізацыі ключавых палажэнняў КІБ РБ у іншых беларускіх раённых выданнях.

ЛІТАРАТУРА

1. *Баранова, Е. В.* Инновационный медиакластер в стратегии управленческой коммуникации / Е. В. Баранова // Медиа в современном мире. 58-е Петербургские чтения: сб. матер. Междунар. науч. форума (18–19 апреля 2019 г.) / отв. ред. В. В. Васильева. В 2-х томах. Т. 1. – СПбГУ, 2019. – С. 51–52.

2. Доктрина информационной безопасности РФ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://rg.ru/2016/12/06/doktrina-infobezobasnost-site-dok.html. – Дата доступа : 15.10.2020.

3. *Жаўняровіч, П.* Моўная палітра раённых газет / П. Жаўняровіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://elib.bsu.by/handle/123456789/19593. – Дата доступа : 01.11.2020.

4. *Закупень, Т. В.* Понятие и сущность информационной безопасности и ее место в системе обеспечения национальной безопасности российской федерации / Т. В. Закупень [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.aselibrary.ru/datadocs/doc_965hu.pdf. – Дата доступа : 01.11.2020.

5. Концепция информационной безопасности Кыргызской Рэспублики [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://cbd.minjust.gov.kg/act/view/ru-ru/13652. – Дата доступа: 15.10.2020.

6. Концепция информационной безопасности Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://president.gov.by/uploads/documents/2019/1post.pdf. – Дата доступа: 01.11.2020.

7. Концепция национальной безопасности РБ [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.prokuratura.gov.by/ru/acts/kontseptsiya-natsionalnoy-bezopasnosti-respubliki-belarus/. – Дата до-ступа: 01.11.2020.

8. *Лисовская, Ю. П.* Информационная безопасность в современном глобализованном мире / Ю. П. Лисовская // Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – Мінск : БДУ, 2015. – № 2. – С. 93–97.

9. О Концепции информационной безопасности Республики Казахстан [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://tengrinews.kz/zakon/prezident-respubliki-kazahstan/kultupa/id-U1100000174/. – Дата доступа: 15.10.2020.

10. Опубликована Концепция информационной безопасности Беларуси // БелТА [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.belta.by/society/view/opublikovana-kontseptsija-informatsionnoj-bezopasnosti-belarusi-340452-2019/. – Дата доступа: 01.11.2020.

11. Прэзідэнту прадставілі праект Канцэпцыі інфармбяспекі Беларусі // Лоеўскі край [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.loevkraj.by/2019/03/prezidentu-pradstavili-praekt-kancepcyi-infarmbyaspeki-belarusi/. – Дата доступа: 15.10.2020.